# Пад сценамі старажытных замкаў

Урок па вучэбным прадмеце “Чалавек і свет” у IV класе

**А. В. Кандрацюк,**
настаўнік пачатковых класаў вышэйшай катэгорыі
гімназіі № 2 г. Пінска,

**Мэта:** фарміраванне ў вучняў першапачатковых ведаў аб старажытных замках, помніках гісторыі і культуры Беларусі.

**Задачы:**

– пазнаёміць з прызначэннем замкаў, са знешнім выглядам і сучасным станам Крэўскага, Лідскага, Гродзенскага, Нясвіжскага, Гальшанскага,Мірскага замкаў, Сынкавіцкай царквы-крэпасці; пашыраць веды пра знакамітых гістарычных асоб;

– ствараць умовы для развіцця памяці, аналітычнага мыслення вучняў;

– садзейнічаць выхаванню ў вучняў пачуцця павагі да продкаў, гонару за гісторыка-культурную спадчыну Беларусі.

**Абсталяванне:** Чалавек і свет.Мая Радзіма – Баларусь: вучэбны дапаможнік для 4 кл. агульнаадукац. шк. з бел. і рус. мовамі навучання/ С.В. Паноў, С.В. Тарасаў.-Мн., 2018, прэзентацыя па тэме ўрока, маршрутны ліст з заданнямі па тэме ўрока (стужка часу; картасхема Беларусі); артыкул “Царква-крэпасць” (паводле У.Мазго), куфры з заданнямі, карткі для індывідуальнай работы “Дзявятачка”.

**Формы арганізацыі пазнавальнай дзейнасці:** франтальная, індывідуальная.

**Ход урока**

**I. Арганізацыйна-матывацыйны этап**

Адгадайце, пра што ідзе гаворка. Яна нічога не каштуе, але многае дае. Яна цягнецца імгненне, а ў памяці можа застацца назаўсёды. Яна бывае ласкавай, адкрытай, шырокай, кіслай, хітрай, нацягнутай, да вушэй, галівудскай. Гэта ўсмешка.

І я хачу, каб вы зараз падарылі ўсмешку мне, сваім суседзям і нашым гасцям.Бо, як кажуць у народзе, як ты да людзей, так і людзі да цябе. Усміхнешся ты – усміхнуцца табе.

**II. Уводзіны ў тэму ўрока. Пастаноўка мэты і задач урока**

Ці ведаеце вы, што Беларусь з'яўляецца адной з самых багатых на скарбы краін Еўропы. Справа ў тым, што па тэрыторыі нашай краіны праходзілі гандлёвыя шляхі з поўначы на поўдзень і з захаду на ўсход.

*А які гандлёвы шлях вы ведаеце?*

Менавіта гэта і паўплывала на колькасць пакінутых тут каштоўнасцей. За апошнія 200 гадоў на тэрыторыі Беларусі было знойдзена больш за тысячу розных скарбаў. І часцей за ўсё іх знаходзілі пад сценамі старажытных замкаў.

Тэма нашага ўрока так і гучыць "Пад сценамі старажытных замкаў".

*Дэманструецца мультымедыйная прэзентацыя "Пад сценамі старажытных замкаў".*

Якія задачы мы можам паставіць перад сабой на сённяшнім уроку? У гэтым нам дапаможа схема ў вашых маршрутных лістах.

| | |
|---|---|
| Ведаем | Чаму Беларусь называлі краінай замкаў?<br>Чаму большасць замкаў будавалася на мяжы старажытнай дзяржавы? |
| Даведаемся | Вялікае Княства Літоўскае<br>Вітаўт<br>крыжакі |
| Навучымся | Рэч Паспалітая<br>Напалеон Орда<br>Радзівілы |
| Зразумеем | Адрозніваць замак ад іншых пабудоў |

**III.Вывучэнне новага матэрыялу**

У лістападзе я была на экскурсіі ў Мірскім і Нясвіжскім замках. І адтуль прывезла 8 куфраў. Гандляр гаварыў, што яны былі знойдзены ў падзямеллях замкаў. Што ў куфрах, я не ведаю, але спадзяюся, што там скарб. Але адзін з куфраў адкрыецца толькі тады, калі вы ***разгадаеце рэбус і даведаецеся, адкуль паходзіць назва "замак".***

Разгадванне рэбуса.

,,  С=М

**замок**

Слова *замак* паходзіць ад слова *замок.* І сапраўды, старажытныя ўмацаванні можна назваць замкАмі. ЗАмкі замыкалі нашу краіну ад знешніх ворагаў, яны былі надзейным замкОм дзяржавы.

У старажытнасці замкі будавалі праз кожныя 30-40 кіламетраў. Зараз іх налічваецца амаль 150.

Спачатку замкі будаваліся з дрэва. Самая старажытная мураваная пабудова на тэрыторыі Беларусі – Камянецкая вежа. Мураваная – значыць пабудаваная з кАменю або з цэглы.

Але адна вежа – гэта яшчэ не замак. Некалькі абарончых вежаў, тоўстыя сцены паміж імі, пад’ёмны мост – вось гэта замак.

*Паглядзіце, калі ласка, на схему замка (Дадатак 1). З якіх яшчэ элементаў складаўся замак?* (Байніцы, пад’ёмны мост, брама, земляны вал і роў з вадой, унутры жылыя памяшканні, склады для зброі і харчавання, палац князя, замкавы двор, калодзеж, капліца або царква, лазня.)

*А ці ведаеце вы, што такое лазня?*

*Якой вышыні маглі дасягаць вежы? (Ад 16 да 25 м)*

*Якой была вышыня і таўшчыня сцен?(Вышыня ад 12 да 14 м, таўшчыня 3 і болей метраў).*

*Назавіце даўжыню замкай сцяны. (Дасягала 400 м).*

*Падлічыце, калі ласка, перыметр і плошчу замкавага двара, пры ўмове, што ён мае квадратную форму. (Р- 1600 м, S-160 000м2)*

(Падводжу іх да высновы: замак — гэта ўмацаванае збудаванне, прыстасаванае не толькі для жыцця, але і для працяглай абароны.)

У першай палове XIV ст., па загадзе вялікага князя Гедыміна, у ВКЛ для абароны супраць крыжакоў былі пабудаваны першыя мураваныя замкі ў Лідзе, Навагрудку, Крэве.

**<u>Лідскі замак</u>**

Мы выканалі першае заданне і ў нас ёсць магчымасць адкрыць наступны куфар. Паглядзіце, тут зноў ляжыць запіска: ***Адпраўляйцеся ў Лідскі замак і адкажыце, што звязвае замак з цыркам, стадыёнам і коўзанкай.***

*А ці ведаеце вы, што такое коўзанка?*

*Дык што звязвае Лідскі замак з цыркам, стадыёнам і коўзанкай?*

*Ці згодны вы з тым, што ў Лідзе быў пабудаваны менавіта замак?*

У вашых маршрутных лістах ёсць картасхема нашай краіны. Прачытайце заданне. Абазначце гэты замак на карце ўмоўным знакам (Дадатак 3).

**Навагрудскі замак.**

А зараз у нас ёсць магчымасць адкрыць наступны куфар. І зноў запіска: ***Адпраўляйцеся ў сталіцу Вялікага Княства Літоўскага і адкажыце, колькі вежаў было ў Навагрудскім замку?***

*Якія землі аб'яднаціся ў Вялікае Княства Літоўскае?* (Беларускія і літоўскія землі.)

*У якім стагоддзі яно ўтварылася?* (13 ст.)

*Назавіце сталіцу Вялікага Княства Літоўскага.* (Навагрудак)

Зараз у гэтым горадзе мы не ўбачым такога цудоўнага замка, засталіся толькі фундамент і рэшткі сцен. Гэты замак лічыўся самым магутным на беларускіх землях.Спачатку замак быў драўляны, потым, у XIV ст.стаў каменным. Яго пабудавалі на высокай замкавай гары. Меў 7 вежаў, з якіх захаваліся дзве. З цягам часу замак пачаў патроху разбурацца. Быў час, калі замак быўператвораны ў сметнік. Зараз замчышча расчышчана, рэшткі вежаў умацаваны ад разбурэнняў (закансерваваны). Адчуць сябе рыцарам Сярэднявечча можна падчас рыцарскага фэсту (фестывалю).

*Што цікавага запомнілі пра замак у Навагрудку?*

*Колькі вежаў было ў Навагрудскім замку?*

*Абазначце Навагрудскі замак умоўным знакам на карце (Дадатак 3).*

**Крэўскі замак**

Адкрыем яшчэ адзін куфар. І зноў запіска: ***Прачытайце артыкул у падручніку і адкажыце, што прымусіла Вітаўта апрануць жаночае адзенне.***

*Прачытайце матэрыял падручніка (с.* ***62—63).***

*Што прымусіла Вітаўта апрануць жаночае адзенне?*

*Абазначце Крэўскі замак на карце ўмоўным знакам.*

**Сынкавіцкая царква-крэпасць**

Заданне выканалі, можам адкрыць яшчэ адзін куфар. Заданне: ***звярніцеся да артыкула Уладзіміра Мазго і даведайцеся, ці можа царква быць аднaчасова і царквой, і крэпасцю.***

*Самастойна прачытайце артыкул і выканайце заданні да яго (Дадатак 4).*

*Ці можа царква* быць *аднaчасова і царквой, і крэпасцю?*

*Якія элементы будынка нагадваюць крэпасць?* (Магутныя сцены, высокія вежы, вузенькія акенцы-байніцы высока ад зямлёй)

*Абвядзіце на малюнку байніцы царквы.*

*Для чаго служылі байніцы?*

*Прачытайце, з якім заклікам звяртаецца да нас аўтар.*

*Абазначце Сынкавічскую царкву на карце ўмоўным знакам (Дадатак 3).*

Калі злучыць на карце замкі ў Крэве, Лідзе, Навагрудку і *Сынкавіцкую царкву-крэпасць,* то мы ўбачым, што гэтыя замкі склалі так званую лінію абароны ад крыжакоў, названую «Каменным поясам».

**Фізкультхвілінка**

**<u>Гродзенскі замак</u>**

Мы можам адкрыць яшчэ адзін куфар. І тут няма скарбу, але ёсць запіска: ***Адпраўляйцеся ў Гродзенскі замак і даведайцеся, што такое Рэч Паспалітая.***

Вельмі старажытную гісторыю мае Гродзенскі замак. Лічыцца, што пачалі будаваць яго з дрэва яшчэ ў 11 ст. Але ў канцы 14 ст. здарыўся моцны пажар. Якраз у той час, калі там знаходзіўся Вітаўт са сваёй сям'ёй. Яны ледзь не загінулі. Паданне сведчыць, што абудзіла князя і жонку прыручаная малпа. Замак згарэў, і Вітаўт загадаў пабудаваць новы каменны замак. Замак ў Гродне быў рэзідэнцыяй князёў Вялікага Княства Літоўскага і каралёў Рэчы Паспалітай. Такую назву атрымала новая дзяржава, якая ўтварылася ў 16 стагоддзі. У яе аб'ядналіся Вялікае Княства Літоўскае і Польскае Каралеўства. У складзе гэтай дзяржавы знаходзіліся беларускія, украінскія, польскія і літоўскія землі. (Дадатак 2). На дошку паняцці, стужка часу.

Паказ на гістарычнай карце межаў Рэчы Паспалітай.

*Абазначце гэты замак на карце ўмоўным знакам (Дадатак 3).*

***Як называлася новая дзяржава, якая ўтварылася** ў 16 стагоддзі?*

***Якія дзяржавы ўвайшлі ў яе склад?***

**<u>Гальшанскі замак</u>**

Заданне выканалі,можам адкрыць яшчэ адзін куфар. І зноў запіска: ***Пазнаёмцеся з замкам у Гальшанах і адкажыце, які беларускі пісьменнік у сваёй творчасці звярнуўся да падання, звязанага з замкам у Гальшанах?***

Адпраўляемся ў Гальшаны

*Які пісьменнік у сваёй творчасці звярнуўся да падання, звязанага з замкам у Гальшанах?*

*Абазначце Гальшанскі замак на карце ўмоўным знакам.*

**<u>Мірскі замак.</u>**

Адкрываем куфар і чытаем запіску: ***Пазнаёмцеся з замкамі ў Міры і Нясвіжы і адкажыце, хто такія Радзівілы.***

**Мірскі замак – з'яўляецца візітнай карткай Беларусі.**

***Мірскі замак*** пабудаваны ў пачатку 16 ст. (1506-1510 г.) каля мястэчка Мір, што на Гродзеншчыне.Па вуглах замка размешчаны чатыры вежы, пятая вежа з брамай. Спачатку гаспадарамі Мірскага замка быў род Ільінічаў, а потым замак перайшоў да рода Радзівілаў.

*Паглядзіце на малюнак у падручніку на с. 61.Што знаходзіцца ў вежы?* (Турма, княжацкі пакой, запасы збожжа і ежы)

Сёння ў замку прадстаўлены макеты старажытных беларускіх замкаў, творы жывапісу, мэбля, зброя, музычныя інструменты, прадметы быту.

**<u>Нясвіжскі замак</u>**

Самым прыгожым і багатым замкам з тых, што захаваліся ў Беларусі, з'яўляецца Нясвіжскі замак. Нясвіжскі замак знаходзіцца ў Мінскай вобласці. Быў пабудаваны ў канцы 16 ст.(1583 годзе). Гаспадарамі гэтага велічнага збудавання былі князі Радзівілы. Самыя вядомыя з іх Мікалай Радзівіл Чорны і Барбара Радзівіл. Як і ў Мірскім замку, тут шмат цікавага. Адметна тое, што ў замкавай бібліятэцы было 20 тысяч кніг.Яны размяшчаліся ў 12 залах, карцінная і партрэтная галерэя, багатая калекцыя зброі, знакамітыя слуцкія паясы. Сярод усіх каштоўнасцей замка найвялікшай з'яўляецца Радзівілаўскі летапіс. А яшчэ гавораць, што гаспадары гэтых замкаў не жадаюць пакідаць сваю маёмасць.Прывіды Радзівілаў часта наведваюць замкі.

Зараз у замках знаходзяцца музеі, яны адкрыты для наведвальнікаў.Мірскі і Нясвіжскі замкі ўключаны ў Спіс сусветнай культурнай спадчыны ЮНЭСКА. (ЮНЭСКА – гэта міжнародная арганізацыя, якая займаецца абаронай гістарычных і культурных помнікаў).

І Мірскі, і Нясвіжскі замкі былі адноўлены (адрэканструяваны)

Як вы думаеце, што дапамагло рэстаўратарам іх аднавіць. Адкуль людзі ведаюць, як замкі выглядалі раней? Смартфонаў і фотаапаратаў тады яшчэ не было. (Адказы дзяцей)

**<u>Рубрыка "Карысна ведаць".</u>**

Правільна, па малюнках мастакоў. Аўтарам гэтых замалёвак стаў таленавіты мастак Напалеон Орда. Сам мастак нарадзіўся на Брэстчыне, у Іванаўскім раёне. Ён шмат падарожнічаў, а пасля сваіх вандровак пакінуў замалёўкі замкаў і палацаў. І рабіў ён гэта вельмі дэталёва.Як выглядалі гэтыя замкі мы можам убачыць не толькі на яго карцінах, але і на грашовых купюрах (вартасцю 50 і 100 рублёў). Наведваў неаднойчы і Пінск. Школа мастацтваў Пінска носіць імя славутага земляка.

*Хто такія Радзівілы?*

*Абазначце Мірскі і Нясвіжскі замкі на карце ўмоўным знакам (Дадатак 3).*

**IV. Дамашняе заданне**. С. 60-67 — прачытаць, адказаць на пытанні.

**V. Замацаванне вывучанага матэрыялу**

Адкрываю апошні куфар.

І сапраўды скарб, але не ўсё так проста. Каб яго атрымаць, трэба выканаць

апошняе заданне.

***Тэст “Дзявятачка”.*** Калі вы згодны з выказваннем, замалюйце клетку чырвоным колерам, якая адпавядае нумару пытання, калі не – пакіньце пустую.

1.Замак — гэта ўмацаванае збудаванне, прыстасаванае не толькі для жыцця, але і для працяглай абароны. (Так)

2. Самыя знакамітыя замкі Беларусі – Мірскі і Нясвіжскі. (Так)

3. Сынкавіцкая царква-крэпасць была пабудавана па загадзе князя Радзівіла. (Не)

4. Мірскі і Нясвіжскі замкі ўключаны ў Спіс сусветнай культурнай спадчыны. (Так)

5. Царква ў Сынкавічах з’яўляецца і царквой, і крэпасцю адначасова. (Так)

6. Рэч Паспалітая ўтварылася ў 20 ст. (Не)

7. Напалеон Орда быў мастаком. (Так)

8.Беларусь называюць “краінай замкаў”. (Так)

9. Лідскі і Крэўскі замкі былі вельмі падобныя. (Так)

**VI. Падвядзенне вынікаў урока. Рэфлексія**

*А зараз давайце звернемся да тых задач, якія мы ставілі ў пачатку ўрока.*

*Ці даведаліся?*

*Які замак вы б хацелі наведаць? Чаму?*

Да нашых дзён, на жаль, няшмат засталося замкаў — у гэтым вінаваты не толькі час, але і наша ўласная няўвага. Замкі — агульнанародная гордасць, бо стваралiся яны непасрэдна народам, яго намаганнямі і талентамі. Сёння замкі — помнікі архітэктуры, гістарычны скарб, валодаць якім не толькі вялікая радасць, але і вялікая адказнасць. Зберагчы гэты скарб — абавязак кожнага з нас.

У пачатку снежня 2019 года будаўнікі приступілі да добраўпарадкавання тэрыторыі каля Гальшанскага замка. У выніку земляных работ быў сур’ёзна пашкоджаны могільнік 14 стагоддзя. Работы праводзіліся без удзелу археолагаў і з парушэннямі дзеючага заканадаўства.

Многія турысты, адпраўляючыся ў Крэва на экскурсію, забіралі з сабой у якасці сувеніра часткі крэпасной сцяны – камні, асколкі цэглы. Таму ў 2018 г. замак быў закансерваваны. Запланавана яго рэканструкцыя.Вось так, у выніку бяздумнай дзейнасці чалавека, мы губляем тое, што павінны захаваць.

Ад многіх замкаў захаваліся руіны альбо толькі успаміны. Зараз у Беларусі прынята праграма па аднаўленні і захаванні замкаў.

Прапаную напісаць пасланне нашчадкам, людзям будучыні, пакласці яго ў капсулу часу, якую можна будзе адкрыць праз 20 гадоў (Дадатак 3).

Цяпер вы можаце адправіць сваё пасланне праз гады.

**Дадатак 1**




1. Роў, запоўнены вадой, які акружае замак.

2.Вал, узведзены вакол замка.

3. Пад’ёмны мост.

4. Брама (уяздныя вароты).

5. Замкавыя сцены.

6.Замкавы двор з воінамі, абаронцамі замка, капліца або царква, калодзеж, лазня.

7. Палац князя.

8. Галоўная вежа.

**Дадатак 2**

**Рэч Паспалітая** – новая дзяржава, у якую ў **16 стагоддзі** аб’ядналіся Вялікае Княства Літоўскае і Польскае каралеўства. У складзе гэтай дзяржавы знаходзіліся беларускія, украінскія, польскія і літоўскія землі.

**Радзівілы** – старажытны род князёў.

**Стужка часу**




**Дадатак 3**



**Дадатак 4**

## Царква-крэпасць



Царква – гэта пабудова, дзе людзі моляцца Богу. А крэпасць дапамагае абараняцца ад ворагаў. Ці магчыма паяднаць іх у адно цэлае?

У вёсцы Сынкавічы ўзвышаецца царква. Ініцыятарам яе будаўніцтва называюць вялікага князя Вітаўта. Яму ўдалося ўцячы з-пад моцнай варты, але трэба было дзесьці схавацца ад пагоні. Вітаўт знайшоў сабе надзейны прытулак у ціхай вёсцы на Гродзеншчыне. У знак удзячнасцімясцовым жыхарам, якія выратавалі жыццё Вітаўта, ён загадаў пабудаваць у вёсцы храм. Так узнікла Сынкавіцкая царква-крэпасць. Яе паўтараметровыя цагляныя сцены і высокія вежы з байніцамі нагадваюць старажытны замак. Унутры – вінтавыя цагляныя лесвіцы. Яны падымаюцца да абарончых паясоў байніц.

Чырвоныя цагляныя сцены Сынкавіцкай царквы-крэпасці быццам абпалены полымем войнаў, паліты крывёю нашых продкаў. А вочы байніц глядзяць на нас з надзеяй, каб мы заўсёды памяталі сваю мінуўшчыну і берaглі мір на зямлі*(паводле У. Мазго).*

**Дадатак 5**

Паважаныя людзі будучыні!

Сёння 17 снежня 2019 года мы, вучні 4 “Б” класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 7 г. Пінска”, пабывалі пад сценамі старажытных замкаў Беларусі. Даведаліся шмат цікавага пра гістарычнае мінулае нашай Радзімы. Зразумелі, што ў нас ёсць што паглядзець і чым ганарыцца. Шанаваць і паважаць сваю спадчыну – абавязак кожнага беларуса.

Беражыце _________.

Памятайце: без мінулага няма будучага!__________________.